УДК 811.161.1'42
Сідарэнка А.С.

СПОСАБЫ МОЎНАЙ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ЭМОЦЫЙ (на матэрыяле англійскай, беларускай і рускай моў)

Эмоцыі, якія вызначаюць саму сутнасць чалавека, яго дзейнасць і адносіны да навакольнага свету, з'яўляюцца прадметам навуковай цікавасці з часу зараджэння чалавечай самасвядомасці. Эмацыйная сфера чалавека па-ранейшаму звяртае на сябе ўвагу шматлікіх даследчыкаў у рамках розных дысцыплін: псіхалогіі, псіхіятрыі, медыцыны, філасофіі, лінгвістыкі. У апошнія дзесяцігоддзі ў сувязі з актывізацыяй лінгвакультуралагічных і псіхалінгвістычных даследаванняў у рэчышчы антрапалагічнай навуковай парадыгмы назіраецца значная цікавасць лінгвістаў усяго свету да эмацыйнай сферы чалавека і спосабаў яе вербалізацыі.

Эмоцыі, як лічыць пэўная група лінгвістаў (Л.Г. Бабенка, Л.А. Калімуліна, О.Я. Філімонава і інш.), могуць быць рэпрэзентаваны ў мове трыма асноўнымі спосабамі: прамой намінацыяй (страх, каханне, гнеў), непасрэдным выражэннем (выклічнікі, клічныя канструкцыі) і апісаннем (асаблівасцей гаворкі і голасу, поглядаў, рухаў і г. д.).

У вузкім сэнсе слова, выражэнне эмоцый звязана з «маўленчымі рэакцыямі, якія носяць спантанны характар і не цалкам усведамляюцца суб'ектам эмоцыі»; выражэнне эмоцый заўсёды зыходзіць ад самога суб'екта [3]. Да сродкаў выражэння эмоцый належаць, галоўным чынам, выклічнікі, што падзяляюцца на спецыфічныя выклічнікавыя маркеры, якія выказваюць вызначаныя эмоцыі, і неспецыфічныя, да якіх адносяцца шматфункцыянальныя выклічнікі (*Ах!, Ох!, Ой!*) і клічныя канструкцыі (напрыклад, *Oh God! Almighty God! О Божа! Усемагутны Божа! Божа ж мой!*), што суправаджаюць большасць эмоцый чалавека.

У выпадках, калі адсутнічаюць выклічнікі, якія непасрэдна выражаюць эмоцыі, у якасці эматыўных сродкаў выступаюць намінанты – назоўнікі і словы катэгорыі стану, пры ўмове, што яны выкарыстоўваюцца суб'ектам эмоцыі ў той момант, калі ён яе адчувае (*Oh, horror! Oh, any horror but this! Які жах! Які сорам! Какой ужас!*).

У вусным маўленні эмоцыі выяўляюцца часцей за ўсё з дапамогай паўзы, змены тэмпу, рытму гаворкі, вышыні голасу, г. зн., перш за ўсё з дапамогай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інтанацыі, што на пісьме адлюстроўваецца пунктуацыйна (звычайна шматкроп'ем ці працяжнікам) ці з дапамогай рэмарак у тэкстах, у якіх падаецца апісанне эмацыйнага стану чалавека, напр.: *Was it possible they heard not? Almighty God! – no, no! They heard! – they suspected! – they knew! – they were making a mockery of my horror!* [13, с. 264]; *Я хадзіў, тупаючы, узад і ўперад, нібы раззлаваны іхнымі заўвагамі, але шум няўхільна нарастаў. О Божа! Што я мог зрабіць? Я шалеў – я хапераваў – я лаяўся! <...> Ён гучнеў, гучнеў, гучнеў! <...> Я адчуваў, што мушу або закрычаць, або памерці! Во цяпер зноўку!... Гучней! Гучней! Гучней! Гучней!...* [8, с. 11].

Намінацыя эмоцыі ажыццяўляецца з дапамогай прамога называння той ці іншай эмоцыі, галоўным чынам, з дапамогай квазісінонімаў. Квазісінонімы – гэта «словы, блізкія па значэнні, але іх немагчыма ўзаемазамяняць ва ўсіх кантэкстах (у адрозненне ад сінонімаў)» [6]. У кожным ланцужку квазісінонімаў вылучаюцца дамінантныя кампаненты, якія лічацца спецыялізаванымі маркерамі эмоцый, у той час як астатнія кампаненты ланцужка належаць да ўскосных маркераў.

Калі ўзяць, напрыклад, наступныя ланцужкі квазісінонімаў (*fear – terror – horror – dread – fright – awe; страх – жах – боязь – спалох; испуг – боязнь – страх – ужас*), то дамінантай у гэтых выпадках з'яўляецца лексема *fear / страх*, іншыя кампаненты разглядаюцца ў якасці ўскосных маркераў эмоцыі страха. Дамінанты ўключаюць у сябе інварыянтныя кампаненты значэнняў лексем. Квазісінонімы адрозніваюцца па такіх сэнсавых прыметах, як чыннік эмоцыі, інтэнсіўнасць, працягласць, магчымасць кантраляваць эмоцыю, ступень выражэння здольнасці да дзеяння, спосаб знешняй праявы. Напрыклад, у беларускай мове адрозніваюцца паводле інтэнсіўнасці лексемы *страх* і *жах*: «страх – пачуццё і постаць вельмі моцнага спалоху, боязь» [10, с. 337]; «жах – моцны страх да змянення» [9, с. 255]. У англійскай мове квазісінонімы *fear* і *horror* размяжоўваюцца не толькі паводле інтэнсіўнасці, але і паводле чынніка эмоцыі: «fear – an unpleasant often strong emotion caused by anticipation or awareness of danger» [12]; «horror – a strong feeling of fear caused by something extremely unpleasant» [12].

Апісанне эмоцыі з'яўляецца «аб'ектам рэфлексіі, г. зн. самаацэнкі, ці адзнакі, якой падвяргаецца стан чалавека з боку, і, такім чынам, носіць пераважна рацыянальны характар» [3]. Можна вылучыць наступныя найбольш тыповыя для мастацкіх тэкстаў спосабы апісання эмоцый.

1. Праектыўны (саматычны) спосаб прадугледжвае «апісанне эмоцыі праз яе вонкавыя праявы: спантаныя рухі, жэсты, міміку, змены характару гучання гаворкі, фізіялагічныя змены ў арганізме чалавека» [3]. Традыцыйна вылучаюць наступныя разнавіднасці праектыўнага спосабу:

а) кінемны (апісанне рухаў і жэстаў суб'екта эмоцыі: *to shrink away, to shrink back, quivering fingers, tottering knees, trembling limbs*; *ускочыць, адхінуцца, зваліцца, апусціць галаву, танцаваць, горбіцца, разгойдвацца; лихора-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дочно двигаться, отскочить, дрожащие губы, дрожащие колени, широко раскрытые глаза, закрыть глаза), напр.: *...and it is said there were times when the animal caused the gaping crowd who stood around to recoil in horror from the deep and impressive meaning of his terrible stamp...* [13, с. 41]; *Зося ўся сцялася і спалохана адступіла ад яго* [11]; *В дали рощи, из-за кладбищенской церкви, вдруг что-то мелькнуло и с бешеной быстротой, темным клубком понеслось на меня – я, вне себя, шарахнулся в сторону, вся голова у меня сразу оледенела и стянулась, сердце рванулось и замерло...* [4].

б) фізіялагічны (апісанне знешняга выражэння фізіялагічных рэакцый арганізма чалавека ў тым ці іншым эмацыйным стане: *to turn pale, to grow pale, to become fearfully pallid, an icy chill runs through one's frame, heart beats heavily, heart ceases to beat; чырванець, змакрэць, задрыжаць, збялець, замерці, заплакаць, закашляцца; замереть, задыхаться, оцепенеть, содрогаться, дрожать, бледнеть*), напр.: *For some moments all were paralyzed with awe – but the urgency of the case soon restored them their presence of mind* [13, с. 13]; *Яраш адчуў, што праз рукі яго быццам прапусцілі электрычны ток, закалола ў кончыкі пальцаў ... У яго былі надзвычай чуткія пальцы, паталагічна чуткія, нават уласныя эмоцыі ён перш за ўсё адчуваў пальцамі. Вось так заколе – значыцца, злосць, радасць, здзіўленне* [11]; *Выйдя от доктора Дубяго, Ниночка вся дрожала от негодования и злости* [1];

в) прасадычны (апісанне змен характару гучання гаворкі суб'екта эмоцыі, яго міжвольных гукавых рэакцый: *to scream, to cry, to shout, to quaver, to shriek; мямліць, сіпець, заікацца, крычаць, скуголіць, лямантаваць, стагнаць, віскатаць; кричать, вопить, стонать, ахнуть, говорить сбивчиво*), напр.: *Presently I heard a slight groan, and I knew it was the groan of mortal terror* [13, с. 259]; *Я і не спадзяваўся на такі вынік маіх слоў, але пасля іх голас ціха войкнуў і спуджана закудахтаў...* [5]; *Наконец в мои грезы ворвался вопль ужаса и смятения, а потом – гул встревоженных голосов, к которому примешивались тихие стенания печали, а может быть, страдания* [7, с. 57].

2. Выкарыстанне сродкаў славеснай выразнасці, у прыватнасці – метафар і параўнанняў (*to shake as the quivering plumes upon the hearse, enveloped in terror as in a shroud, to make one's blood run cold, to freeze the current of my blood; кроў халадзела, па целе папаўзлі мурашкі, белы як смерць, белай статуяй застыць; сердце замерло, словно прирасти к месту, дрожать, как в лихорадке*), напр.: *...I perceived the huge jaws at the extremity of the proboscis suddenly expand themselves, and from them there proceeded a sound so loud and so expressive of wo, that it struck upon my nerves like a knell...* [15]; *Улоў мой быў зусім мізэрны, і таму я быў злы, як поп, які прыйшоў на хаўтуры і раптам заўважыў, што нябожчык уваскрэс* [5]; *И вновь металась женщина, горя в дикой радости своей, как в огне. И так наполнила своими движениями комнатку, как будто не одна, а несколько таких полубезумных женщин говорило, двигалось, ходило, целовало* [2].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Указанне на вынікі, да якіх могуць прывесці эмоцыі (*to die through sheer terror, to be speechless from the memory of horror, to swoon, to fall into violent hysterics; становіцца дрэнна, ледзь не памёр ад сораму, сэрца можа разарвацца, пастарэць, звар'яцець ад радасці; помешаться от страха, обезуметь от страха, лишиться чувств, умереть от страха, впасть в истерическое состояние, броситься бежать*), напр.: *It will be taken for granted, no doubt, that upon hearing this speech under the circumstances, we all either made for the door, or fell into violent hysterics, or went off in a general swoon* [14]; *Я чакаў, што яна страціла прытомнасць, звар'яцела ад жаху, памерла, але толькі не таго, што пабачыў... [5]; Люди обезумели от страха и считали, что во всем повинны духи чумы, бесы моровой язвы или демоны горячки* [7, с. 66].

4. Апісанне прадметаў і тых іх якасцяў, якія здольны выклікаць пэўную эмоцыю (*fiendish expression, demonlike propensities, dark hints, a hideous and unnatural fervor; магільная цішыня пакоя, нязграбны чалавек, змрочна высіцца, неверагодна жорсткае забойства, агідны ўчынак, няўдалы выбар, справядлівая адзнака; чудовищная страсть, дьявольская жестокость, кошмарный случай, жуткое происшествие, странное обличье*), напр.: *The eyes, before invisible, now more an energetic and human expression, while they gleamed with a fiery and unusual red...* [13, с. 34]; *І твар гэтага мужчыны быў жывейшы ... і такі дзіўны, жорсткі і змрочны, што можна было спалохацца...* [5]; *С этого времени корабль шел в полный бакштаг, продолжая свой зловещий путь прямо на юг под всеми парусами и поминутно окуная ноки своих брамрей в непостижимую для человеческого ума чудовищную бездну вод* [7, с. 48].

5. Згадванне агульнавядомых, стэрэатыпных сітуацый, якія маюць дачыненне да пэўных эмоцый, напр.: *There is no passion in nature so demoniacally impatient as that of him who, shuddering upon the edge of a precipice, thus meditates a plunge* [13, с. 222]; *Я жахнуўся, пабачыўшы яго, як жахаецца чалавек, які праспаў ноч у ложку і толькі ранкам знайшоў у ім змяю, якая залезла туды для цеплыні...* [5]; *...мою душу поражали то смятение и страх, которые овладевают человеком, когда он, охваченный головокружением, смотрит в мрачные глубины неведомой бездны* [7, с. 61].

Варта згадаць адну важную асаблівасць моўных рэпрэзентацый эмоцый, якой, паводле некаторых даследчыкаў (В.І. Шахоўскі, С.В. Іонава, Д.А. Раманаў), з'яўляецца іх сінсемантызм, г. зн. «недастатковасць уласна моўнага выражэння дзеля перадачы складаных эмацыйных станаў, неабходнасць актуалізацыі ў тэксце цэлага комплексу сродкаў дзеля адэкватнай перадачы эмоцый» [6]. У большасці выпадкаў моўнай рэпрэзентацыі эмоцый можна назіраць спалучэнне апісання эмоцыі з яе непасрэднай намінацыяй, напр.: *to remain motionless through extremity of terror and awe, to shrink away with horror; здранцвелы ад страху твар, прашыпець з гневам, з абурэннем.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, асноўныя спосабы вербальнай рэпрэзентацыі эмоцый прадстаўлены пераважна эматыўнымі (выконваюць функцыю непасрэднага выражэння эмоцый) і параэматыўнымі сродкамі, якія ўключаюць у свой склад намінанты і дэскрыптары і ажыццяўляюць, адпаведна гэтаму, функцыі намінацыі і апісання эмоцый.

Літаратура

1 *Аверченко, А.Т.* Ниночка [Электронный ресурс] / А.Т. Аверченко. – 2010. – Режим доступа: http://lib.ru/RUSSLIT/AWERCHENKO/ninochka.txt – Дата доступа: 01.11.2010.

2 *Андреев, Л.Н.* Тьма [Электронный ресурс] / Л.Н. Андреев. – 2010. – Режим доступа: http://www.infoliolib.info/rlit/andreev/tma.html. – Дата доступа: 01.11.2010.

3 *Антонова, Л.Е.* Семантика стыда и способы ее выражения в современном русском языке: норма и субстандарты: автореф. дис. …канд. филол. наук: 10.02.01 [Электронный ресурс] / Л.Е. Антонова; Санкт-Петербургский гос. ун-т. – СПб., 2009. – Режим доступа: http://www.spbu.ru/files/upload/disser/phylology/2009/antonova.doc – Дата доступа: 25.03.2010.

4 *Бунин, И.А.* Поздний час [Электронный ресурс] / И.А. Бунин. – 2010. – Режим доступа: http://bunin.niv.ru/bunin/rasskaz/temnye-allei/pozdnij-chas.htm – Дата доступа: 30.10.2010.

5 *Караткевіч, У.С.* Дзікае паляванне караля Стаха [Электронный ресурс] / У.С. Караткевіч. – 2010. – Режим доступа: http://knihi.com/karatkievic/palavannie.html – Дата доступа: 19.08.2010.

6 *Никольская, И.Г.* Семантика сомнения и способы ее выражения в русском языке: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 [Электронный ресурс] / И.Г. Никольская; Санкт-Петербургский гос. ун-т. – СПб., 2009. – Режим доступа: http://www.spbu.ru/files/upload/disser/phylology/2009/nikolskaya.doc – Дата доступа: 09.03.2010.

7 *По, Э.А.* Рассказы / Э.А. По. – М.: Правда, 1979. – 448 с.

8 *По, Э.А.* Сэрца падказвае / Э.А. По // Наша Ніва. – 1993. – № 11. – С. 11.

9 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / рэдкал.: А.Я. Баханькоў [і інш.]; пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск: БелСЭ, 1978. – Т. 2. – 768 с.

10 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / рэдкал.: А.Я. Баханькоў [і інш.]; пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск: БелСЭ, 1983. – Т. 5. – 663 с.

11 *Шамякін, І.П.* Сэрца на далоні [Электронный ресурс] / І.П. Шамякін. – 2010. – Режим доступа: http://knihi.com/samiakin/serca.html – Дата доступа: 19.08.2010.

12 Merriam-Webster's Online Dictionary [Electronic resource]. – 2010. – Mode of access: http://www.merriam-webster.com – Date of access: 22.05.2010.

13 *Poe, E.A.* The Premature Burial. Stories: книга для чтения на английском языке / Е.А. Рое. – СПб.: КАРО, 2007. – 368 р.

14 *Poe, E.A.* Some Words with a Mummy [Electronic resource] / E.A. Poe. – 2010. – Mode of access: http://classiclit.about.com/library/bl-etexts/eapoe/bl-eapoe-some.htm – Date of access: 30.10.2010.

15 *Poe, E.A.* The Sphinx [Electronic resource] / E.A. Poe. – 2010. – Mode of access: http://poe.thefreelibrary.com/Poems/1–3 – Date of access: 30.10.2010.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова